Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

30 снежня 2015 года, № 22–23 (2146–2147)

# З Новым годам, дарагія сябры!

*З самымі шчырымі пачуццямі віншую ўвесь шматтысячны калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з Калядамі і Новым годам!*

*Новы год – адно з нешматлікіх святаў, якое па маштабнасці і значнасці не мае геаграфічных і нацыянальных межаў. У гэты дзень усяму свету адкрываецца адлік новым дням і лёсавызначальным падзеям, спадзяванням і памкненням. Напярэдадні калядных дзён мы зайсёды поўныя аптымізму, веры ў свае магчымасці і выкананне задуманага, аналізуем падзеі года, якія адыходзіць, успамінаем няўдачы і поспехі.*

*Мінулы год адзначаны шэрагам важных падзей, якія абавязкова ўвойдуць у летапіс ВНУ. Галоўнае, што варта падкрэсліць, – гэта бліскучы поспех БДУ ва ўмацаванні навукова-адукацыйнага аўтарытэту на міжнародным узроўні. Упершыню БДУ быў уключаны ў прэстыжны сусветны рэйтынг – THE World University Rankings! А ў рэйтынгу QS наш універсітэт працягнуў узыходжанне і ўпершыню патрапіў у групу ВНУ, якія займаюць 421–430 пазіцыю! Гэтыя рэйтынгі ацэньваюць эліту сусветнай адукацыйнай прасторы, і гэта самы найлепшы вынік БДУ за ўсю гісторыю. Дадзеныя падзеі ўслаўляюць не толькі імя БДУ, але і ўмацоўваюць імідж нашай Беларусі на міжнароднай адукацыйнай прасторы!*

*Ганаровы спіс высокіх вынікаў навукова-адукацыйнай дзейнасці ВНУ дапаўняюць перамогі нашых ліцэістаў і студэнтаў на прэстыжных міжнародных алімпіядах, наватарскія ідэі і распрацоўкі навукоўцаў, спартыўныя ўзнагароды нашых спартсменаў. За кожнай значнай падзеяй – велізарная праца кожнага з вас, шаноўныя студэнты і калегі! Я шчыра хачу падзякаваць усім за добрасумленную працу ў мінулым годзе, адказны падыход да выканання пастаўленых задач і ваш удзел у бесперапынным працэсе зрабіць БДУ вядучым не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі!*

*Для БДУ надыходзячы 2016 год – юбілейны. Спадзяюся, што мы годна падрыхтуемся да 95-годдзя нашага ўніверсітэта і прымножым яго славутую гісторыю новымі поспехамі, радаснымі падзеямі і навуковымі адкрыццямі.*

*Са святам, дарагія сябры! Жадаю вам здароўя, поспеху, шчасця, дабрабыту, міру, дабра, новых праектаў і здзяйсненняў. Хай усім нам сёлета спадарожнічае фартуна ва ўсіх нашых пачынаннях і задумах!*

*З павагай,*
***рэктар БДУ акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА***



## У нумары:

ЖАНЧЫНА, ЯКАЯ НЕ ПЕРАСТАЕ ЗДЗІЎЛЯЦЬ
Святлана АЛЕКСІЕВІЧ, выпускніца журфака БДУ, атрымала Нобелеўскую прэмію па літаратуры
Стар. 2

ПРА «ДАРОЖНУЮ КАРТУ» БЕЛАРУСІ Ў БАЛОНСКІМ ПРАЦЭСЕ
Гутарка з загадчыцай кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ Вольгай ЖУК
Стар. 4

НАВУЧАННЕ Ў БДУ БОЛЬШ ІНТЭНСІЎНАЕ, ЧЫМ У КЕМБРЫДЖЫ
Размова з загадчыкам кафедры клеткавай біялогіі і біяінжынерыі раслін Вадзімам ДЗЯМІДЧЫКАМ
Стар. 5

## Весткі з рэктарата

**ПЕРШЫМ** прарэктарам БДУ прызначаны акадэмік Алег ІВАШКЕВІЧ. Алег Анатольевіч скончыў БДУ ў 1976 г. З 1997 па 2009 г.г. дырэктар НДІ ФХП, які пад яго кіраўніцтвам тройчы (2005, 2006, 2007) быў занесены на Рэспубліканскую дошку пашаны. У 1998 г. стаў доктарам навук. У 2004 г. абраны членам-карэспандэнтам, а ў 2009 г. – акадэмікам НАН Беларусі. З 2009 г. – прарэктар па навуковай рабоце БДУ.

А. А. Івашкевіч узнагароджаны медалём Ф. Скарыны (2009). Ганаровы доктар Сібірскага аддзялення РАН (2012), лаўрэат Дзяржпрэміі Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі (2013). Ён – аўтар 420 навуковых прац, у тым ліку больш за 200 артыкулаў, 96 з якіх апублікаваны ў замежных выданнях, а таксама навучальнага дапаможніка «Прыкладная квантавая хімія» з грыфам Міністэрства адукацыі. А. А. Івашкевіч мае 44 аўтарскія пасведчанні і патэнты. Падрыхтаваў 2 дактароў і 5 кандыдатаў хімічных навук.

***

СТАРШЫНЁЙ Студэнцкай асамблеі абраны сакратар ПА ГА «БРСМ» з правамі РК БДУ Яўген ХАРУК. Справаздачна-выбарная сесія Студэнцкай асамблеі БДУ прайшла 23 снежня.

Падчас сесіі былі заслуханыя даклады аб дзейнасці асамблеі па асноўных кірунках працы, вызначаныя далейшыя вектары развіцця. Такія арганізацыйныя мерапрыемствы праводзіцца не радзей чым адзін раз у год.

Студэнцкая асамблея БДУ – вышэйшы прадстаўнічы орган студэнцкага самакіравання, які быў створаны 30 кастрычніка 2014 г. Дадзеная структура прадстаўляе інтарэсы студэнцтва перад органамі кіравання ВНУ, выкладчыцкім корпусам, грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі, такім чынам, умацоўваючы міжуніверсітэцкія, міжрэгіянальныя і міжнародныя сувязі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## «Навагодняя паштоўка»

Адмысловая святочная акцыя праходзіла ў БДУ 22, 23, 24 і 28 снежня. Яе асаблівасць заключалася ў тым, што запоўненыя ўласнаручна віншаванні на карпаратыўнай паштоўцы БДУ былі адпраўлены адрасатам у той жа дзень. Прычым уся карэспандэнцыя дастаўлялася бясплатна.



Такая цёплая рэтра-акцыя нагадала ўдзельнікам настальгічную сувязь часоў і пакаленняў, калі не было e-mail і віншавальныя паштоўкі са зваротамі і пажаданнямі традыцыйна атрымлівала кожная сям'я з паштовай скрыні.

Адным з першых павіншаваў сваіх родных рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка. А з 23 снежня тры паштовыя урны «вандравалі» па факультэтах БДУ. Там валанцёры прапаноўвалі студэнтам і выкладчыкам падчас вялікага перапынку карпаратыўныя навагоднія паштоўкі. Тым, хто не змог у прызначаныя дні напісаць пасланне, прапанавалася на сайце БДУ запампаваць карпаратыўныя паштоўкі і прымацаваць іх да электронных лістоў-віншаванняў сваім калегам, партнёрам, сябрам і знаёмым.

Арганізатарамі акцыі выступілі Студэнцкая асамблея і ўпраўленне па справах культуры БДУ.

# Жанчына, якая не перастае здзіўляць

**У кастрычніку Беларусь даведалася пра прысуджэнне Нобелеўскай прэміі па літаратуры беларускай пісьменніцы Святлане АЛЕКСІЕВІЧ, выпускніцы журфака БДУ, аўтару нашумелага цыкла «Галасы Утопіі» і шэрагу кніг, перакладзеных на 19 моў свету.** А ўжо 10 і 11 снежня ў Стакгольме адбылася афіцыйная цырымонія ўручэння «Нобеля» з рук шведскага караля Карла Густава, за якой пахвілінна сачыў амаль кожны беларус.



Святлана Алексіевіч з дыпломам Нобелеўскага лаўрэата



1985. Фота Юрыя Іванова



Кабул, 1988



Тытульны ліст падарунка факультэту журналістыкі

У сваёй прамове на афіцыйным прыёме Святлана Алексіевіч яшчэ раз узгадала сваіх суайчыннікаў, пра лёс якіх яна непрыхавана пісала: «Я дзякую Шведскай акадэміі за высокую ўзнагароду, якую не маю права сабе прысвоіць, я разумею яе як паклон многім пакаленням савецкіх людзей, якія яшчэ нядаўна жылі разам у велізарнай краіне СССР... Як паклон іх пакутам і іх болю».

Творчасць Алексіевіч ярка вылучаецца на фоне сучаснай літаратуры і стаіць як бы асобна: яе нельга ацаніць адназначна, як і саму пісьменніцу, у венах якой цячэ сумесь беларускай і ўкраінскай крыві. Нарадзілася яна ў 1948 г. у Івана-Франкоўску, а пасля дэмабілізацыі бацькі ўся сям'я перабралася ў Беларусь. Калі скончыла школу, працавала карэспандэнтам раённай газеты «Прыпяцкая праўда» ў Нароўлі, а ў 1967 г. яна паступіла на факультэт журналістыкі па спецыяльнасці «друкаваныя СМІ».

Праз два гады яе запрашаюць на працу ў «Сельскую газету» ў Мінск, дзе яна застаецца жыць, а ў 1976 г. атрымлівае пасаду кіраўніка аддзела нарыса і публіцыстыкі ў «Нёмане». Але ўсяго гэтага быццам было недастаткова, быццам чагосьці не хапала ў яе жыцці – менавіта тады і пачынаецца доўгія пошукі сябе і свайго героя.

Усё пачалося з кнігі *«Я з'ехаў з вёскі» (1976)* пра тых, хто пераехаў жыць у горад з маленькіх мястэчак, аднак яе забараніла цэнзура ЦК Кампартыі БССР і зборнік застаўся неапублікаваным. У 1983 выходзіць *«У вайны не жаночае аблічча»*, дакументальная аповесць пра Вялікую Айчынную вачыма жанчын-франтавічак. Працягваючы ваенную тэму, праз два гады Алексіевіч выпусціць кнігу *«Апошнія сведкі: кніга недзіцячых расказаў»*, а ў 1989 – *«Цынкавыя хлопчыкі»*. У аснову трэцяй кнігі ляглі гісторыі «сыноў Афгана», якія пісьменніца сабрала ў чатырохгадовай паездцы па «краіне смерці».

Затым выйшлі *«Зачараваныя смерцю» (1993)*, у 1997 г. апублікавана *«Чарнобыльская малітва»*, а ў 2013 – нашумелая *«Час second-hand»*, якая канчаткова аформіла цыкл «Галасы Утопіі», цыкл пра феномен савецкай дзяржавы і пра надыходзячую смерць «чырвонага чалавека».

Кожная з тэм у яе творчасці вострасацыяльная і выклікае мноства няскончаных дыскусій. Працягваюць ставіцца п'есы па матывах кніг Алексіевіч, здымаюцца як дакументальныя, так і мастацкія фільмы, а яна не перастае пісаць: вядома, што цяпер вядзецца праца над кнігай *«Цудоўны алень вечнага палявання»*, якая ў гэты раз складаецца з аповедаў пра каханне – усё-такі Алексіевіч, як бы там ні было, застаецца проста жанчынай.

Але што ж ведаюць і думаюць пра «першага беларускага «Нобеля» студэнты і выкладчыкі журфака?

**Юлія ЛУК'ЯНЮК, філолаг, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання:**

– Для мяне Алексіевіч – незвычайны пісьменнік. З яе першымі раманамі я пазнаёмілася яшчэ ў школе, а ва ўніверсітэце нават абараняла курсавую працу па яе творчасці, аналізавала творы «Цынкавыя хлопчыкі» і «Чарнобыльская малітва». Наогул, яе зборнікі асацыююцца ў мяне з хорам, дзе сольныя партыі арганічна зліваюцца ў адзінае цэлае, дзе не перадаецца простая гісторыя падзей. Гэта, галоўным чынам, гісторыя эмоцый, гісторыя душ (часам, на мой погляд, залішне агаленая). Яна разглядае ў сваіх кнігах найбольш актуальныя і самыя горкія для Беларусі гістарычныя падзеі (чарнобыльскую катастрофу, вайну ў Афганістане, Вялікую Айчынную) праз прызму індывідуальных асаблівасцяў і інтарэсаў кожнай асобнай асобы. Гісторыю цікавяць выключна факты, а Алексіевіч глядзіць на свет не толькі як гісторык, але і як пісьменнік, як журналіст, як чалавек і, вядома, як жанчына.

**Валерый ШЭІН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры тэле- і радыёвяшчання:**

– Вы разумееце, што такое атрымаць «Нобеля» для Беларусі? Ды гэта ж проста няўяўна! Нобелеўскіх лаўрэатаў па літаратуры з усёй постсавецкай прасторы – адзінкі, а зараз сярод іх і наша Святлана. Так, яна ўславіла нашу краіну.

Алексіевіч я ведаў не сказаць каб блізка, усё-такі мая спецыяльнасць – радыёжурналістыка, а яна тады вучылася на «друкаваных СМІ», але журфак тады быў вельмі маленькі, групы невялікія, таму выкладчыкі ведалі ў твар амаль усіх студэнтаў. Напрыклад, мы ўсе разам ездзілі на бульбу, часта сустракаліся ў калідорах.

Можа, гэта прагучыць троху стэрэатыпна, але я памятаю яе вельмі ціхай, сціплай, нават закрытай студэнткай, яна заўсёды была як бы ў сабе, у сваіх думках – такая незаўважная, апраналася някідка.

Апошні раз я бачыўся з Алексіевіч у рэдакцыі «ЛіМ», мы з ёй тады так душэўна пагаварылі пра ўсё, пра дробязі нейкія, пра жыццё ў цэлым. Наогул, з ёй я магу размаўляць на якія заўгодна тэмы, яна выклікае да сябе прыхільнасць.

Што тычыцца яе творчага крэда, то лічу, што Святлана не майстар мастацкага слова, нават не публіцыст – яна дакументаліст, вось як. Хаця яе кнігі, вядома, выходзяць за рамкі разумення як простага інтэрв'ю ў журналісцкай апрацоўцы, так і нейкай чыстай дакументалістыкі, хранікальных запісаў і да таго падобнага. З Алексіевіч, я скажу, атрымаўся б ниядрэнны радыёпубліцыст – менавіта так я ахарактарызаваў бы яе спецыялізацыю.

Вельмі часта яе параўноўваюць з Быкавым і з Талстым, як з родапачынальнікамі такога «інтэрв'юійнага» жанру, але, мне здаецца, Святлана выйшла ўжо на іншы ўзровень, бо яе тэксты – больш гутаркі, а не інтэрв'ю. Пераасэнсаванне таго, што ёй казалі, пра што распавядалі, чым дзяліліся, як раскрываліся перад ёй. Аднак і ідэя Алексіевіч у гэтым не новая: да яе першым у падобнага кшталту дакументалістыцы працаваў Алесь Адамовіч. У прынцыпе, яна і заве яго сваім настаўнікам, сваім правадыром. Ён падказаў ёй, а далей, як бачыце...

**Аляксандр ЖЫБУЛЬ, студэнт 3 курса Інстытута журналістыкі:**

— Упершыню я пазнаёміўся з творчасцю Алексіевіч, калі мне было гадоў 12. Прачытаў кнігу «У вайны не жаночае аблічча», затым былі «Цынкавыя хлопчыкі» – абедзве мяне моцна ўразілі. Вельмі натуралістычна ўсё апісана: катаванні, перажыванні, гісторыі рэальных людзей.

Я ганаруся тым, што ў нашай краіне ёсць такія людзі. А Алексіевіч асабіста паважаю за яе погляды, адвагу (хоць бы за «Цынкавых хлопчыкаў», матэрыял для якой збіраўся ў Афганістане) і прынцыповасць. Я спадзяюся, што ўсе калі-небудзь уцямяць, убачаць у ёй сапраўднага журналіста і выдатнага пісьменніка. Здароўя ёй і творчых поспехаў!

**Людміла УШАКОВА, бібліятэкар 1 катэгорыі ФБ БДУ:**

— Цікавы факт, які мала хто ведае: каля пятнаццаці гадоў таму назад Алексіевіч ахвяравала Фундаментальнай бібліятэцы БДУ, а канкрэтна нашаму аддзяленню факультэта журналістыкі, тысячу долараў. У той час яе «душапрыказчыкам» выступіў намеснік галоўнага рэдактара «Народнай волі» – Мікалай Тоўсцік. Вядома, такая сума праводзілася не адразу, а часткамі, перыядычна. У выніку мы закупілі на гэтыя грошы больш як трыста кніг.

Некалькі кніг на нямецкай і шведскай мовах падарыла сама Алексіевіч (у агульным доступе медыятэкі БДУ, не лічачы замежных, можна знайсці творы Святланы Алексіевіч: ад «Апошніх сведкаў: кнігі недзіцячых расказаў» да «Часу second-hand», паміж якімі розніца амаль што ў трыццаць гадоў – *заўв. аўт.*).

**Віктар ШЫМОЛІН, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, фотажурналіст:**

— Са Святланай Алексіевіч я пазнаёміўся, памятаецца, гадзе ў 1971, калі яна працавала загадчыцай аддзела нарыса і публіцыстыкі ў часопісе «Нёман», а я – пачынаў рэпарцёрам аддзела навін у «Вячэрнім Мінску», асвойваў тады новы для сябе жанр фотанарыса і вырашыў прынесці матэрыял, прысвечаны юбілею Мінскага трамвая (50 гадоў). Калегі, даведаўшыся пра «прэм'еру», падказалі: «Нясі ў «Нёман!» – балазе рэдакцыя была побач, і шмат часу на дарогу не сышло.

Алексіевіч сустрэла мяне па-добраму, як калега калегу. Яна хутка прабегла поглядам па рукапісе і сказала: «Пакідай, я пагляджу, а праз пару дзён забягай».

«Забег» я, значыцца, у прызначаны час... Святлана адкрыла рукапіс і пачала рэзюмаваць: неяк па-жаночаму і зусім не строга прамовіла: «Міленька, вельмі міленька... Загаловак трэба замяніць». І тут жа, вывеўшы круглявым почыркам на першай старонцы шаркавай аўтаручкай, напісала новую назву: «Зямная арбіта Мінскага трамвая». Ну, гэта было так па-філасофску, мне вельмі спадабалася, і я пагадзіўся.

Пасля выхаду часопіса з маім нарысам наша знаёмства працягнулася на творчай аснове ў выглядзе яшчэ пары іншых матэрыялаў. А калі яна сышла з часопіса, я «перакінуўся» на іншыя выданні. Але міжволі я ўсё ж заставаўся сведкам яе творчага росту і цешыўся выхаду кожнай новай кнігі.

А аднойчы мы нават выпадкова сутыкнуліся на мінскіх вуліцах так, як быццам развіталіся ўчора. А насамрэч прайшло больш за два дзясяткі гадоў. Сутыкнуўся я з ёй на Гарадскім Вале і спачатку нават не пазнаў. Праляцелыя гады не робяць нас маладзейшымі. А Святлана, як мне здавалася, ніколі не звяртала асаблівай увагі на «прыкід», як цяпер кажуць, не фарбавалася. І таму выглядала як карэнная мінчанка, заклапочаная кухняй і вялікай сям'ёй. На галаве, я запомніў, у яе была нейкая нямодная хустка, але раптам яна паглядзела на мяне гэтак жа, як і шмат гадоў назад: молада і здзіўлена: «Ну як ты?» – «А што ў цябе?» – «А памятаеш?...» У такім вось рэчышчы і была гутарка. Пра ўсё і ні пра што.

Я ж ніколі не цікавіўся яе праблемамі, не лез у асабістае жыццё. Канешне, ведаў, што Святлана шмат працуе, выдае кнігі, што водгукі на яе публікацыі вельмі супярэчлівыя. Вядома, сёе-тое чытаў, але змест яе твораў здаваўся мне вельмі цяжкім. Увесь час нагадваць чытачам пра жахі вайны, крыві, людскія трагедыі – ноша зусім нялёгкая. Ды і пісаць такое не проста, калі за акном сонца, прырода, жыццё.

...Яна мне яшчэ калісьці падарыла кнігу «У вайны не жаночае аблічча» і напісала да яе такі аўтограф, прычым проста так, без усіх гэтых «паважаных», зыходзячы з нашых адносін, яна напісала: «Віктар, не перастаавай дзівіцца жанчыне!». І мне вельмі спадабалася. Гэта яшчэ адна маленькая рыска да яе партрэта.

Вобраз Алексіевіч, які складаецца цяпер дзякуючы супярэчлівым публікацыям у СМІ, шмат у чым няслушны. Успомніце, як раней асуджалі Быкава за яго праўдзівыя кнігі. Але прайшоў час, які дазволіў ацаніць іх сэнс і глыбіню спакойна і аб'ектыўна. Тое ж самае, на мой погляд, чакае і творчую спадчыну Алексіевіч.

Для мяне яна ніколі не будзе нейкай такой жанчынай-вамп ці помнікам на пастаменце са знакам лаўрэата Нобелеўскай прэміі. Я па-ранейшаму бачу ў ёй простую, мілую жанчыну. Добрую, гатовую прыйсці на дапамогу, даць параду калегу, адказаць на любое пытанне. Вось гэта і ёсць самае галоўнае.

**Юлія ДУБОЎСКАЯ**

HI-TECH

# Лекавая бяспека дзяржавы

Сучасная мадэрнізаваная вытворчасць фармацэўтычных субстанцый і лекавых сродкаў, якія адпавядаюць стандартам GMP, урачыста адкрылася 22 снежня на прадпрыемстве **«Унітэхпрам» БДУ.**

У цырымоніі прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА, першы прарэктар ВНУ акадэмік Алег ІВАШКЕВІЧ, кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы Аляксандр КРАПАК, прадстаўнікі двух міністэрстваў: адукацыі і аховы здароўя Беларусі.

Дырэктар РУП «Унітэхпрам» БДУ **Павел БЫЧКОЎСКІ** падкрэсліў: «Мадэрнізацыя праводзілася ў рамках праекта «Стварэнне малатанажнай вытворчасці фармацэўтычных субстанцый для атрымання супрацьпухлінных, кардыятропных і іншых лекавых сродкаў, якія адпавядаюць стандартам GMP, на базе арганізацый Мінадукацыі». Праект уваходзіць у Дзяржаўную праграму «Імпартазамяшчальная фармпрадукцыя», і тэрміны яго рэалізацыі разлічаны на 2013–2015 гады».

За мінулыя два гады ў рамках праекта была ажыццёўлена рэканструкцыя шматфункцыянальнага будынка па адрасе вул. Курчатава, 1а і яго аснашчэнне высокатэхналагічным абсталяваннем. Усё высакаякаснае тэхнічнае абсталяванне выраблялася ў Германіі, Швейцарыі і Расіі і адпавядае сучасным патрабаванням. Падчас рэканструкцыі былі адкрыліся два вытворчыя ўчасткі: па вытворчасці супрацьпухлінных субстанцый і лекавых сродкаў; па вытворчасці кардыятропнай субстанцыі ***«Нітаргал»***.

Наменклатура планаванай вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі «Унітэхпрам» БДУ ўключае арыгінальны супрацьпухлінны лекавы сродак ***«Цысплацел»***, джэнерычную субстанцыю ***«Тэмазаламід»***, супрацьпухлінны прэпарат для лакальнай хіміятэрапіі пухлін галаўнога мозгу высокай ступені злаякаснасці ***«Тэмадэкс»*** і антыангінальны прэпарат *«Нітаргал»*. Гэтыя прэпараты маюць сусветную навізну і патэнтавую абарону ў Беларусі і Расіі. «Стварэнне вытворчасці супрацьпухлінных прэпаратаў у нашай краіне вельмі важнае для лячэння хворых, таму што купля прэпаратаў такога кшталту за мяжой – гэта вельмі дорага для бюджэту. У Беларусі лячэнне анкалагічных пацыентаў – бясплатнае», – зазначыў падчас адкрыцця вытворчых лабараторый «Унітэхпрам» БДУ рэктар ВНУ акадэмік Сяргей Абламейка.

Прэпарат «Цысплацел» зніжае пакінутыя пасля аперацыі блукаючыя ракавыя клеткі. Пры гэтым малаверагодна, што на месцы выдаленай пухліны не пойдуць метастазы. Лекі «забіваюць» ракавыя клеткі на працягу 30–40 сутак. То бок, дзейнічаюць беражліва. Гэта першы айчынны і другі ў свеце супрацьпухлінны прэпарат для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных пухлін галаўнога мозгу, шыі, паласці рота, языка, носа і прыдаткавых пазух. Прэпарат імплантуецца ў ложа хірургічна выдаленай пухліны, цалкам рассмоктваецца і забяспечвае працяглае ўздзеянне на пакінутыя ракавыя клеткі, забяспечваючы поўнае прыгнечанне іх росту. Пры гэтым значна памяншаецца доза цытастатыку, а такім чынам і таксічная нагрузка на арганізм.



*Экскурсія па новых лабараторыях РУП «Унітэхпрам» БДУ*

Па дадзеных клінічных выпрабаванняў, ужыванне прэпарата спрыяе значнаму павелічэнню працягласці жыцця і працягласці безрэцыдыўнага перыяду ў хворых з пухлінамі галаўнога мозгу, росту ліку вылечаных пацыентаў пры злаякасных пухлінах у вобласці галавы і шыі. Кошт беларускага прэпарата эквівалентны 120 доларам. Заўважым, адзіны яго аналаг па спосабе ўжывання (лакальная хіміятэрапія пухлін галаўнога мозгу) – прэпарат «Гліядэл» (ЗША), каштуе 15–18 тысяч долараў за 1 упакоўку, што ў 50 разоў перавышае кошт «Цысплацелу».

Акрамя таго, на адкрытай вытворчасці будзе наладжаны выпуск па новых правілах супрацьпухліннай субстанцыі (субстанцыя – актыўнае рэчыва любых лекаў) біяраскмоктвальнага гідрагелю «Тэмадэкс». Гэты прэпарат выпускаюць на РУП «Белмедпрэпараты». Яго ўжываюць у камбінаванай хіміяпрамянёвай тэрапіі гліём галаўнога мозгу (III-IV стадыі), што павялічвае працягласць безрэцыдыўнага перыяду і працягласць жыцця хворых. Антыангінальны прэпарат «Нітаргал» адносіцца да лекавых прэпаратаў класа арганічных нітратаў і, як усе яны, валодае антыангінальным і антыішэмічным эфектамі, супастаўнымі з эфектамі імпартнага прэпарата «Кардыкет» вытворчасці фірмы Schwrz Pharma AG.

Адзначым, спажыўцом фармацэўтычных субстанцый, якія выпрабляюцца ва «Унітэхпрам», з'яўляецца РУП «Белмедпрэпараты», якое робіць канчатковыя лекавыя формы.

Такім чынам, у Беларусі забяспечваецца вытворчасць поўнага цыкла атрымання фармацэўтычнай прадукцыі. Іх вытворчасць на базе «Унітэхпрам» БДУ дазволіць забяспечыць лекавую бяспеку дзяржавы, часткова імпартазамяшчэнне супрацьпухлінных прэпаратаў і лячэбных сродкаў, якія валодаюць антыішэмічным, антыгіпертэнзіўным эфектамі.

Выпуск беларускіх супрацьпухлінных прэпаратаў забяспечыць насельніцтва даступнымі сродкамі лячэння, дазволіць павялічыць працягласць жыцця хворых на злаякасныя пухліны галаўнога мозгу, працягласць безрэцыдыўнага перыяду і палепшыць якасць жыцця.

Фінансаванне распрацоўкі ажыццяўлялася са сродкаў інавацыйных фондаў Мінгарвыканкама, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і за кошт уласных сродкаў «Унітэхпрам» БДУ.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Плён з Туркменістана

Два пратаколы аб намерах пра супрацоўніцтва падпісаны паміж БДУ і туркменскімі арганізацыямі. Цырымоніі падпісання адбыліся 11–13 снежня ў рамках працы Нацыянальнай выставы-кірмашу Беларусі ў г. Ашхабадзе.

Першы дакумент датычыцца дамоўленасці з Туркменскім сельскагаспадарчым інстытутам пра пастаўку мікрахвалевых тэхналогій і ЗВЧ-установак апрацоўкі насення бавоўніку. Другі пратакол складзены з Міністэрствам харчовай прамысловасці Туркменістана пра пастаўку абсталявання для мікрахвалевай апрацоўкі насення таматаў.

Такама значным вынікам працы дэлегацыі БДУ у Нацыянальнай выставе-кірмашы Беларусі ў г. Ашхабадзе стала ўзгадненне падпісання трох кантрактаў з САТ імя С. Разметава на пастаўку мікрахвалевых тэхналогій і ЗВЧ-установак для сушкі і абеззаражання садавіны, перадпасяўной апрацоўкі насення бавоўны і гародніны.



Акрамя таго, з Туркменскім дзяржаўным універсітэтам імя Махтумкулі дасягнута дамоўленасць пра арганізацыю ўзаемнага абмену студэнтамі па спецыяльнасці «геаграфія» падчас вытворчых практык і разгледжана прапанова Туркменскага інстытута транспарту прачытаць курс лекцый у галіне мікрахвалевых тэхналогій на інжынерным факультэце інстытута.

Нагадаем, Нацыянальная выстава-кірмаш Беларусі ў Ашхабадзе праводзілася з нагоды 20-годдзя нейтралітэту Туркменістана. БДУ на дадзенай экспазіцыі прадставіў распрацоўкі ў галіне касмічных тэхналогій, ГІС-сістэм, сельскай гаспадаркі, медыцыны, харчовай прамысловасці, робататэхнікі і інш.

Дэлегацыю БДУ ўзначаліў прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Панарадаў.

У наш час у БДУ навучанне праходзяць каля 700 туркменскіх грамадзян, якія па колькасці знаходзяцца на першым месцы сярод студэнтаў з іншых краін.

**Паводле інфармацыі Галоўнага ўпраўлення навукі**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: сацыяльнай камунікацыі, сацыялогіі, паліталогіі, міжнародных эканамічных адносін,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, ядзернай фізікі, радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, вышэйшай матэматыкі, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, бія- і нанамеханікі, нелінейнага аналізу і аналітычнай эканомікі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, заалогіі, малекулярнай біялогіі, неарганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, сацыялогіі, філасофіі культуры, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, канстытуцыйнага права, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, паліталогіі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: энергафізікі, інтэлектуальных сістэм, фізікі і аэракасмічных тэхналогій, фізіялогіі чалавека і жывёл, міжнароднага менеджменту, канстытуцыйнага права, літаратурна-мастацкай крытыкі;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання, аналітычнай хіміі, вышэйшай матэматыкі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н.СЕЎЧАНКІ» БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.05 (оптыка).

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэлефон 212-48-43.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**XII Міжнародны фэст студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар. БДУ–2015»** – радыё «Сталіца» (13.11), БелТА, zn.sb.by, газета «Знамя юности» (20.11), zviazda.by (21.11), Tut.by(23.11).

**Тыдзень кітайскага кіно арганізуе РІКК БДУ і Пасольства КНР у Беларусі** – АНТ (20.11), sputnik.by, БелТА (23.11).

**Адкрыццё філіяла кафедры геадэзіі і картаграфіі геаграфічнага факультэта БДУ на базе Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белгеадэзія»** – БелТА (26.11), БТ-1 (27.11).

**Чацвёртакурсніца хімічнага факультэта БДУ Алеся Карпач ганаравана стыпендыі «Макдональдс»** – Tut.by, interfax.by (18.11), kp.by (19.11), газета «Камсамольская праўда» (20.11).

**Першыя Беларускія Калядныя чытанні прайшлі ў БДУ** – Edu.gov.by, eparhiya.by (01.12), БелТА, радыё «Сталіца», АНТ, СТБ (02.12), patriarchia.ru, studlive.by, verav.ru (03.12).

**Выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сталі лаўрэатамі вышэйшай юрыдычнай прэміі «Феміда»** – БелТА, радыё «Сталіца» (04.12), spok.by (07.12).

**Каманда студэнтаў БДУ ў 16 раз прадставіць Беларусь у фінале чэмпіянату свету па праграмаванні** – Kv.by (03.12), БелТА, ej.by, 5min.by, dev.by, sputnik.by, tut.by, mlife.by, 4esnok.by, newsrbk.ru, 21.by (08.12), vgr.by (15.12).

**Калядны дабрачынны баль адбыўся ў БДУ** – Mogilev-region.gov.by, АНТ, minsknews.by (10.12).

**Другакурснік механіка-матэматычнага факультэта БДУ Павел Бацылеў распрацаваў мабільны дадатак** – БелТА, kv.by (17.12).

**Студэнцкі англійскі клуб адкрыўся ў БДУ** – БелТА, радыё «Сталіца», 21.by (17.12).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Як рэалізуецца «дарожная карта Беларусі» ў межах Балонскага працэсу?

**Сёлета ў маі на канферэнцыі міністраў адукацыі 48 краін Еўрапейскай прасторы Беларусь была прынята ў Балонскі працэс.** БДУ – галоўны ўніверсітэт краіны, і таму ад яго працы па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу шмат у чым залежыць якасць прафесіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў у краіне.

Савет маладых вучоных філалагічнага факультэта ў пачатку снежня зладзіў сустрэчу з загадчыцай кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, доктарам педагагічных навук, прафесарам **Вольгай ЖУК.** Вольга Леанідаўна як член нацыянальнай групы экспертаў па пытаннях рэформы вышэйшай адукацыі падрабязна растлумачыла сутнасць Балонскага працэсу, ахарактарызавала сусветныя сацыякультурныя тэндэнцыі, якія ўплываюць на развіццё вышэйшай адукацыі.

Вольга Леанідаўна адразу падкрэсліла, што прыняцце Беларусі ў Балонскі працэс – гэта сведчанне таго, што наша сістэма вышэйшай адукацыі развіваецца дастаткова эфектыўна. І шматлікія сустрэчы з замежнымі экспертамі пацвярджаюць гэтую добрую ацэнку.

***– Наколькі актыўна ідзе працэс нашай адаптацыі да Балонскага працэсу?***

– Перш за ўсё мы маем так званую Дарожную карту – план мерапрыемстваў па аптымізацыі айчыннай сістэмы вышэйшай адукацыі. Напрыклад, больш поўнае ўкараненне Еўрапейскай сістэмы назапашвання і пераносу крэдытаў. У прынцыпе, мы ўжо яе рэалізуем, новым з'яўляецца тое, што ўпершыню вучэбная нагрузка ацэньваецца не з пазіцыі таго, наколькі «адпрацаваў» са студэнтамі выкладчык, а наколькі плённа студэнт асвоіў тую ці іншую вучэбную дысцыпліну або адукацыйную праграму.

У адпаведнасці з Дарожнай картай мы павінны ўкараніць трохузроўневую структуру вышэйшай адукацыі (бакалаўрскі, магістарскі, дактарскі (аспірантура)). Як вядома, аспірантура ў нас аднесена да паслядыпломнай адукацыі. Зараз разглядаецца пытанне аб уключэнні аспірантуры ў структуру вышэйшай адукацыі. Гэта, безумоўна, узмоцніць збалансаванасць і пераемнасць праграм падрыхтоўкі спецыялістаў і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Таксама з улікам Дарожнай карты нам трэба распрацаваць нацыянальную рамку кваліфікацый. Гэта таксама вельмі вялікая праца, і яе нашы суседзі – Расія, Украіна – ужо ажыццявілі. Размова ідзе аб карэктным апісанні на аснове пераемнасці сучасных кваліфікацыйных патрабаванняў да прафесійнай дзейнасці выпускнікоў усіх ступеняў вышэйшай адукацыі (бакалаўр, магістр, кандыдат навук (доктар)). У Балонскім працэсе выкарыстоўваецца ўніверсальны інструмент – так званыя *Дублінскія дэскрыптары* – для апісання характарыстык ступеняў і кваліфікацый. Нам таксама трэба ўжываць гэты інструмент. Распрацоўку нацыянальнай кваліфікацыйнай рамкі трэба ажыццяўляць сумесна з сектарам працы, працадаўцамі. Хачу падкрэсліць, што ўкараненне еўрапейскай сістэмы крэдытаў і сучаснай нацыянальнай рамкі кваліфікацый з'яўляецца сродкам акадэмічнага прызнання нашых дыпломаў, развіцця крэдытнай мабільнасці студэнтаў.

Яшчэ важным паняццем Балонскага працэсу з'яўляецца *студэнтацэнтрыраваны падыход.* Ён вызначае вектар пераарыентацыі навучальнага працэсу ў ВНУ ад вызначэння (аб'ём гадзін, навучальныя мэты



*Прафесар Вольга Жук тлумачыць студэнтам прынцыпы Балонскай сістэмы*

выкладчыкаў, тэрміны навучання і г.д.) да вучэння як дзейнасці студэнтаў, да больш поўнага ўліку іх адукацыйных магчымасцяў і патрэбаў, патрабаванняў працадаўцаў. Галоўным у навучанні становіцца дзейнасць студэнтаў па засваенні адукацыйных праграм, узрастае аб'ём іх самастойнай працы, адказнасць за атрыманыя вучэбныя вынікі.

***– Вы згадалі крэдытную сістэму. Ці будуць змены закранаць залікова-экзаменацыйную сесію, улік наведвання?***

– Лічу, што гэтыя змены ўжо адбываюцца. Ва ўніверсітэце ўведзена рэйтынгавая сістэма ацэнкі вынікаў навучання, у заліковых кніжках ужо выстаўляюцца крэдыты. Тут вельмі важна кожнаму студэнту разумець, што ацэньваецца менавіта яго вучэбная праца. Крэдыты неабходна зарабіць, выканаўшы шэраг прамежкавых вучэбна-даследчых работ у рамках асваення дысцыпліны або яе модуля, абараніўшы вучэбна-даследчы праект, заданне на перыяд практыкі і г. д.

***– А што менавіта дае крэдытная сістэма? І як ацэньваецца дзейнасць студэнта? Крэдыты – гэта мера ацэнкі «кошту» пэўнай дысцыпліны або паспяховасці выканання вучэбных работ ці здачы экзамену?***

– І тое, і іншае. Усе віды вучэбнай нагрузкі, якую выконвае студэнт, ацэньваюцца крэдытамі – вынікі вывучэння вучэбнай дысцыпліны, яе модуля або цыкла дысцыплін, вынікі практык, самастойная праца студэнтаў па дысцыпліне, выкананне вучэбна-даследчых праектаў, распрацоўка курсавых і выпускных работ і інш. Вызначэнне крэдытаў грунтуецца на розных параметрах. Але абавязкова ўлічваюцца тэрміны навучання, аўдыторныя гадзіны, агульная вучэбная нагрузка студэнта, якая змяшчае ўсе віды выкананай студэнтам вучэбна-даследчай дзейнасці і вынікі навучання.

***– Калі правамерна казаць пра павышэнне якасці адукацыі ў рамках Балонскай сістэмы, то ці правамерна таксама казаць пра павышэнне статусу нашага дыплома?***

– Статус дыплома, безумоўна, падвысіцца. Да дыплома будзе выдавацца спецыяльны дадатак, так званы *Diploma Supplement,* дзе з дапамогай сістэмы крэдытаў і еўрапейскай ацэначнай табліцы будзе выразна пазначана, якія дысцыпліны, якія віды вучэбна-даследчай працы студэнт асвоіў, якія адзнакі атрымаў і колькі набраў у працэсе навучання крэдытаў. І, паколькі гэтая крэдытная сістэма з'яўляецца агульнай для краін Балонскага працэсу і павінна быць звязаная з нацыянальнай і еўрапейскай рамкамі кваліфікацый, то любому эксперту ў еўрапейскай ВНУ будзе зразумела, што ведае і ўмее рабіць уладальнік дыплома і якімі кампетэнцыямі ён валодае. Гэта з'яўляецца, у сваю чаргу, элементам прызнання дыпломаў і ўмовай развіцця мабільнасці студэнтаў.

***– Як Вы лічыце, Балонскі працэс – гэта эвалюцыя або рэвалюцыя для айчыннай вышэйшай адукацыі?***

– Вядома, эвалюцыя. Па сутнасці, у 2010 г. мы былі гатовыя ўвайсці ў Балонскі працэс. Многія патрабаванні ўжо былі выкананы. Гэта ўкараненне двухступеньчатай структуры вышэйшай адукацыі, распрацоўка адукацыйных стандартаў спецыяльнасцяў на кампетэнтнаснай аснове і многае іншае. Таму мы ўжо не адзін год, і нават не адну пяцігодку, рухаемся ў рамках патрабаванняў Балонскага працэсу. Значнае не толькі пашырэнне правоў студэнтаў і выкладчыкаў, звязаных з іх мабільнасцю. Гэта, перш за ўсё, адказнасць за якаснае выкананне вучэбнай нагрузкі, патрабаванне да павелічэння аб'ёму самастойнай працы студэнта, якую ацэньваюць крэдытамі, павышэнне патрабаванняў да педагагічных кампетэнцый выкладчыка – умець арганізоўваць адукацыйны працэс у рамках студэнтацэнтрыраванага падыходу на аснове сучасных эфектыўных методык і тэхналогій, уключаючы інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

***– А ў чым заключаецца студэнтацэнтрываны падыход?***

– Па сутнасці, гэта асобасна арыентаваны падыход, які забяспечвае больш поўны ўлік адукацыйных патрэбаў і магчымасцяў студэнтаў, меркаванняў працадаўцаў па падрыхтоўцы спецыялістаў. Якія інструменты Балонскага працэсу падтрымліваюць дадзены падыход? Па-першае, гэта ўжо разгледжаная намі Еўрапейская сістэма назапашвання і пераносу крэдытаў. Падругое, гэта магчымасць студэнта выбіраць навучальныя дысцыпліны, курсы па выбары і форму навучання, выбудоўваць індывідуальныя адукацыйныя траекторыі па засваенні адукацыйных праграм.

Студэнтацэнтрыраваны падыход мае на ўвазе актывізацыю самастойнай работы студэнтаў – як аўдыторнай, так і пазааўдыторнай. Напрыклад, у абноўленых адукацыйных стандартах спецыяльнасцяў для першай ступені вышэйшай адукацыі Беларусі ўтрымліваюцца 35–40 % дысцыплін і спецкурсаў па выбары студэнтаў. 50 % ад аб'ёму гадзін па дысцыпліне адводзіцца на самастойную працу студэнтаў. 30–40 % зместу тыпавых праграм можа змяняцца выкладчыкамі пры распрацоўцы рабочых вучэбных праграм з улікам навуковых інавацый, кірункаў развіцця прафесійнай дзейнасці, патрабаванняў студэнтаў і працадаўцаў. У магістратуры 70 % зместу адукацыйнай праграмы фарміруецца ўстановай вышэйшай адукацыі. З гэтай долі 50 % прыпадае на электыўныя дысцыпліны, якія абірае для вывучэння сам студэнт. Гэтыя палажэнні з'яўляюцца нарматыўна-метадычнай асновай для рэалізацыі студэнтацэнтрыраванага падыходу.

***– Безумоўна, Балонскі працэс дае магчымасці студэнтам стажыравацца за мяжой. А ці ўзрасце мабільнасць навуковых работнікаў і выкладчыкаў?***

– Канешне. У рамках Балонскага працэсу існуюць спецыяльныя праграмы, напрыклад, *Erasmus+, «Гарызонт 2020».* Яны накіраваны на далучэнне выкладчыкаў да міжнародных праектаў. У гэтай сувязі ўзрастаюць патрабаванні да педагагічных кампетэнцый выкладчыкаў: гатовасць удзельнічаць у навуковых даследаваннях, валоданне англійскай мовай, якая становіцца ўніверсальнай у навуковых даследаваннях. Напрыклад, у 2015 г. падчас конкурсу праектных прапаноў па праграме Erasmus+ у рамках інструмента «Развіццё патэнцыялу ў сферы вышэйшай адукацыі» беларускія ВНУ са сваімі замежнымі партнёрамі ўдзельнічалі ў падачы 46 заявак. Сярод адабраных для фінансавання – 4 праекты, у якіх удзельнічае наш універсітэт. Інфармацыю пра розныя праграмы і міжнародныя праекты можна знайсці на сайце офіса праграмы Erasmus+ у Беларусі *www.erasmus-plus.belarus.unibel.by.* Таксама існуе еўрапейскі сайт Балонскага працэсу – www.ehea.info. Акрамя таго, беларускім офісам праграмы Erasmus+ выпускаецца інфармацыйны бюлетэнь, у якім змяшчаецца карысная інфармацыя і метадычны матэрыял па пытаннях Балонскага працэсу.

***– І апошняе. Як Вы адзначылі, Балонскі працэс – гэта патрабаванне глабалізацыі. Але, пры сваім маштабным характары, гэта працэс, які ўніфікуе сусветную сістэму адукацыі, ці працэс, які падтрымлівае нацыянальную спецыфіку?***

– Вельмі добрае пытанне, і адказаць на яго трэба аднназначна. Як ужо казала, мэта Балонскага працэсу – зрабіць больш гарманічным функцыянаванне і развіццё адзінай Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, садзейнічаць узмацненню яе канкурэнтаздольнасці і прывабнасці. Галоўным прынцыпам Балонскага працэсу застаецца «ўпарадкаваная разнастайнасць». Уласныя стандарты якасці вышэйшай адукацыі мы павінны звяраць са стандартамі якасці вышэйшай адукацыі ў рамках Балонскага працэсу і за кошт гэтага павышаць якасць, эфектыўнасць і даступнасць айчыннай адукацыі.

Але ніхто не прымушае нас ігнараваць уласны лепшы адукацыйны вопыт, нацыянальныя традыцыі ў адукацыі. Балонскі працэс закладвае вектар ва ўдасканаленні нацыянальных сістэм вышэйшай адукацыі. Гэта апераджальная адукацыя. Яна павінна рэагаваць на выклікі і патрабаванні часу, забяспечваць падрыхтоўку спецыялістаў з улікам не толькі актуальных патрабаванняў рынку працы, але і перспектыўных напрамкаў развіцця вытворчасці, навукі, тэхналогій. Сучасны ўніверсітэт, якім з'яўляецца наш БДУ, павінен гарантаваць студэнтам падрыхтоўку да будучыні, а не да мінулага. Таму сёння мы павінны арыентавацца не толькі на патрэбы працадаўцаў, але і ствараць (або абнаўляць) вучэбныя планы і адукацыйныя праграмы «з апераджэннем» і забяспечваць інавацыйнае развіццё краіны.

Так, Балонскі працэс у пэўным сэнсе ўніфікуе Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі, каб вытрымаць націск глабалізацыі і забяспечыць якасць адукацыі. Але пры гэтым на аснове ўпарадкаванай разнастайнасці Балонскія рэформы падтрымліваюць нацыянальную спецыфіку.

**Гутарыў**
**Сяргей МАЕЎСКІ**

# Радыяцыя супраць раку

**Увосень у Мінску адкрыўся ўнікальны цэнтр пазітронна-эмісійнай тамаграфіі (ПЭТ-цэнтр).** Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій БДУ Святаслаў БРЫНКЕВІЧ узначаліў суперсучасную цыклатронна-радыехімічную лабараторыю новага цэнтра. Ён распавёў пра некаторыя тонкасці сваёй працы і патрабаванні да маладога спецыяліста.

Пазітронна-эмісійная тамаграфія з'яўляецца метадам самай ранняй дыягностыкі анкалагічных, кардыялагічных, неўралагічных захворванняў. Метад выкарыстоўваецца як для выяўлення і вызначэння стадыі захворвання, так і для ацэнкі эфектыўнасці схемы лячэння.

Святаслаў Дзмітрыевіч у праекце ПЭТ-цэнтра з самага пачатку.

– Уся праца па ўзвядзенні будынка праходзіла на маіх вачах, што дазволіла добрыя ідэі ўвасобіць у жыццё. Як шмат было дыскусій: дзе заліваць бетон і якія трубы пракласці! Бо ў такой справе ад правільнага будаўніцтва вельмі шмат залежыць: бяспека, эксплуатацыя, камфорт пацыентаў і працаўнікоў...

Пакуль не было ПЭТ-цэнтра, беларусаў для лячэння накіроўвалі ў іншыя краіны, у Германію ці Расію. Бо інакш кошт даследавання быў бы нерэальным.

– Асаблівасцю такой тамаграфіі з'яўляецца тое, што выкарыстоўваюцца караткажывучыя нукліды, перыяд паўраспаду якіх складае ад 20 хвілін да 2 гадзін. Напрыклад, Літва возіць прэпараты з Германіі. Але за час пералёту з 20 доз застаецца толькі 4. Кожныя дзве гадзіны колькасць нуклідаў памяншаецца ў два разы, – пацвярджае хімік.

Акрамя таго, ПЭТ – гэта метад, які дапамагае падабраць схему лячэння, таннейшымі і прасцейшымі спосабамі дасягнуць выніку. Спецыяліст прыводзіць гэтаму адзін вельмі яркі прыклад.

– У ліку першых пацыентаў апынуўся малады хлопец з ракам лімфатычных вузлоў. І да таго, як мы зрабілі яму тамаграфію, ён прайшоў тры курсы хіміятэрапіі. Па пратаколе іх павінна быць шэсць. Але калі ўрачы зрабілі ПЭТ-даследаванне, выявілася, што ачагоў онкапаталогій у яго ўжо не назіраецца. Адпаведна, мы адмянілі тры наступныя курсы хіміятэрапіі.

Святаслаў Брынкевіч цяпер шмат часу прысвячае ПЭТ-цэнтру, аднак працягвае чытаць лекцыйныя курсы і весці семінарскія заняткі ў БДУ. У сваю каманду набірае найлепшых студэнтаў і выпускнікоў, якіх ацэньвае падчас



навучальнага працэсу. Практыку таксама можна прайсці ў цэнтры пазітронна-эмісійнай тамаграфіі.

– Дыпломныя праекты – выдатная магчымасць зразумець, на што здольны будучы спецыяліст, – лічыць выкладчык. – Ёсць складанасці з допускам студэнтаў да працы з радыеактыўнасцю. Тым не менш атрымліваецца вырашаць падобныя праблемы, аднаго-двух чалавек практыкуем. Наогул, калектыў у нас невялікі, цяпер усяго 14 чалавек, якія забяспечваюць усю радыеактыўную вытворчасць. Нас мала, але мы спраўляемся.

Як лічыць Святаслаў Дзмітрыевіч, практычныя заняткі вельмі важныя. Таму, як толькі хімік-фармацэўт перайшоў у шэрагі выкладчыкаў, адразу ж арганізаваў студэнцкую навукова-даследчую лабараторыю «Хімія высокіх энергій». Яе перавага ў тым, што ёсць магчымасць пазнаёміцца з дарагім абсталяваннем, да якога падчас стандартных лабараторных заняткаў не дапусцяць.

– Цяпер я па-ранейшаму ўзначальваю СНДЛ, але шмат у чым ёю займаецца старшы выкладчык Раман Свярдлоў. Пакуль ішло будаўніцтва і пуск цэнтра, не мог шмат увагі надаваць лабараторыі. І тым не менш многія з тых навучэнцаў, што прыходзілі ў лабараторыю, у дадзены момант працуюць ужо ў ПЭТ-цэнтры.

Ці складана працаваць над абсталяваннем, якое ў краіне існуе ў адзінкавым экзэмпляры? Дзе ўчарашняму студэнту набрацца такіх ведаў? Ды і дасведчанаму спецыялісту, які з падобным яшчэ не сутыкаўся? На гэтыя пытанні ў Святаслава Дзмітрыевіча ёсць адказ.

– Нават калі праца наўпрост не звязана са спецыяльнасцю, гэта не страшна. Прафесіяналы накіроўваюцца ў камандзіроўкі для навучання за кошт пастаўшчыкоў абсталявання або РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Пастаўшчык сам зацікаўлены ў тым, каб гэта складанае абсталяванне эксплуатавалі кваліфікаваныя супрацоўнікі. Тады радзей даводзіцца выязджаць на сэрвіснае абслугоўванне, менш разводзіць папяровай працы.

Студэнт, здольны хутка адаптоўвацца да мэт і задач, які патрабуе пэўнае становішча – вось што важна. Людзі вучацца самастойна пры працы з абсталяваннем. Я таксама імкнуся навучыць іх як выкладчык. Але магу з гонарам прызнаць, што ўжо праз паўгода мае падначаленыя робяць настолькі важныя заключэнні, што мне самому дзесьці трэба вучыцца ў іх. Сутыкаючыся кожны дзень з пэўнымі праблемамі ў сваёй вузкай галіне, кожны ў камандзе расце і развіваецца на працоўным месцы, удасканальваецца.

Перспектыў у калектыву Святаслава Брынкевіча вельмі шмат. Да прыкладу, пададзена заяўка ў праграму тэхнічнага абслугоўвання Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі. Калі яе падтрымаюць, з 2016 г. на працягу 2 гадоў маладыя спецыялісты будуць актыўна там стажыравацца.

Але самае каштоўнае тое, што «касцяк» вытворчага комплексу ўжо быў на працоўных месцах тады, калі толькі заканчвалася будаўніцтва. Многія эксперты – выпускнікі кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій БДУ. Яны знаёміліся з новым абсталяваннем падчас зборкі і яго ўстаноўкі, фарміруючыся ў адзіны калектыў. Галіна гэтай навукі яшчэ вельмі маладая, але разам з перспектыўнымі і дзейнымі навукоўцамі за ёй будучыня.

**Гутарыла**
**Таццяна МОРАВА**

Чытайце цалкам на
gazeta.bsu.by

# У БДУ навучанне больш інтэнсіўнае, чым у Кембрыджскім універсітэце

**Загадчык кафедры клеткавай біялогіі і біяінжынерыі раслін біялагічнага факультэта БДУ Вадзім ДЗЯМІДЧЫК 12 гадоў прапрацаваў у Кембрыджскім універсітэце і Універсітэце Эсэкса.** Ён распавёў нам пра асаблівасці жыцця і працы на чужыне, а таксама адказаў, чаму ён вярнуўся ў БДУ.

Вадзім Дзямідчык — выбітны спецыяліст у галінах аксідатыўнага стрэсу, іоннага транспарту, механізмаў рэцэпцыі, фізіялогіі стрэсу, росту і сігналізацыі ў раслін. Артыкулы навукоўца з'яўляліся на старонках знакамітых выданняў Nature і Plant Cell, а індэкс цытавання, паводле Web of Science, дасягае 2400. У кастрычніку супрацоўнікі кафедры скончылі даследаванне ўздзеяння раслінных малекул – поліамінаў – на ўстойлівасць раслін да стрэсу. Новая канцэпцыя дазваляе прапанаваць сельскай гаспадарцы сродкі павышэння ўрадлівасці раслін. І гэта далёка не ўсе праекты, якія ажыццяўляюцца пад кіраўніцтвам Вадзіма Дзямідчыка.

У канцы 90-х Вадзім Віктаравіч з'ехаў працаваць у Кембрыджскі ўніверсітэт. Ён узгадвае, што тады ў Кембрыджы было каля 20 навукоўцаў-беларусаў, амаль усе – біёлагі з БДУ, адзін фізік, хімік і эканаміст. У 2005 г. Вадзім Дзямідчык атрымаў пасаду кіраўніка лабараторыі фізіялогіі стрэсу ў Эсэкскім універсітэце пад Лонданам. Але ў 2011 вырашыў вярнуцца ў Беларусь. Прычым ён не толькі пераехаў сам, але і частка перавёз прыборы, з якімі працаваў у Брытаніі.



*– Гэта прынятая практыка ў свеце. Калі няма каму займацца прыборамі, універсітэт усё роўна вымушаны будзе іх збыць па зніжаных коштах. Вельмі ўдзячны за гэтую магчымасць. Калегі з БДУ і асабліва рэктар дапамаглі з пераездам лабараторыі.*

Накопт адукацыі ў Вялікабрытаніі высветлілася, што на спецыяліста-біёлага ці фізіка там вучацца тры гады. Пры гэтым за першы курс студэнтам адзнакі не ідуць у дыплом, у другі сапраўды вучоба, а на апошнім курсе скіраванасць на дыпломную працу. Вадзім Віктаравіч у Эсэкскім універсітэце з 2009 па 2011 гг. займаў пасаду кіраўніка другога года адукацыі, што блізка да намесніка дэкана па вучобе. Ён упэўнены, што наша сістэма адукацыі значна лепшая чым брытанская.

*– Наша праграма навучання ўключае 4500–5000 гадзін. Брытанская – 300–400.*

***– Пытанне, чым гэтыя гадзіны заняць.***

*– Мне здаецца, што галоўнае – развіваць мозг, ён, як і мышцы, патрабуе трэнінгу. І таму 4500 значна лепш у любым выпадку, чым 300. Нашы біёлагі вывучаюць і хімію, і фізіку, і матэматыку. У Брытаніі біёлаг вывучыць толькі сваю дысцыпліну, і гэта рэальна кепска. Фізіёлаг там не ведае заалогіі наогул. Брытанскія топавыя прафесары ведаюць гэту праблему сваёй адукацыі і спрабуюць неяк змагацца. Але змяніць што-небудзь не могуць, бо студэнты ўсё роўна ідуць, бо рэйтынгі ў ВНУ высокія, а ў іх галоўнае не якасць і колькасць лекцый, а фундаментальныя навуковыя даследаванні ВНУ, але яны да адукацыі амаль не маюць дачынення.*

***– Можа, гэта завецца «вузканакіраванасцю»?***

*– Пад гэтым хаваецца банальная эканомія. У Вялікабрытаніі ВНУ вельмі эканомяць і накіроўваюць грошы на даследаванні, бо акадэміі навук з інстытутамі там няма. Адукацыя – тое, чым ВНУ зарабляе, яна можа каштаваць ад 10 тыс. GBP у год. Пражыванне – недзе столькі ж. Гранты можа сабе дазволіць вельмі мала абітурыентаў. Гэта найлепшыя з лепшых, часта замежнікі. ВНУ гатовыя вучыць перамožцаў міжнародных алімпіяд «бясплатна». Наогул, яны сочаць за любімі талентамі і забіраюць іх да сябе. Нам бы так зрабіць. Каштуе гэта няшмат.*

*У брытанскіх ВНУ існуе сістэма ахвяраванняў на навуку. ВНУ – гэта «траст», які атрымлівае грошы – ад спадчыны, ад буйных кампаній і г.д. Калі хтосьці становіцца мільянерам, то ахвяруе 10 % альма-матар.*

Шмат якія праблемы сучаснай навукі, на думку Вадзіма Дзямідчыка, ідуць з неразумення грамадствам ролі навукі.

*– У нашай краіне патрэбныя нешматлікія, але моцныя навуковыя цэнтры. Неабходная адкрытая навуковая сістэма, а гэта сярэднееўрапейскія стаўкі лектарам (каля 2000 долараў у месяц), сістэмы канкурэнтных грантаў (100-200 тысяч долараў у год на грант) і інфраструктурныя гранты (з разліку 100 тыс. долараў у год). І, канечне, магчымасць выкладчыкам прыязджаць з-за мяжы сюды лектарамі без візавых перашкод. Без гэтага ў нас не будзе навукі сусветнага ўзроўню.*

***– Цікава, чаму Вы вярнуліся менавіта на біяфак БДУ?***

*– Я не губляў сувязі з радзімай, з родным факультэтам. Прыязджаў сюды кожны год... Ну проста трэба штосьці для Беларусі зрабіць. Там, чаго хацеў, дасягнуў. Я туды з'ехаў у 27 гадоў. Чужая краіна, чужая мова... У гэтых абставінах вельмі складана жыць. Працэй ехаць у раннія гады, недзе ў 17. Неяк зручней да ўсяго адаптавацца.*

Вадзім Віктаравіч падкрэслівае, што шмат з таго, што мы сёння ведаем пра Злучанае Каралеўства, – гэта стэрэатыпы.

*– Я ўпэўніўся, што беларусы – чыста еўрапейская нацыя. У нас шмат агульнага з заходняй культурай. Нам толькі не хапае разумення сваёй выключнасці, самадастатковасці, няма моцнага гістарычнага міфа. Але мы ўсяго 25 год незалежныя. На жаль многія нашы людзі саромеюцца сваёй краіны, думаюць, што на захадзе ўсё лепшае, хоць самі не жылі там і нічога не бачылі. Мяркуюць па тэлеперадачах, дзе паказваюць паспяховых людзей і лепшыя месцы.*

У лабараторыі фізіялогіі і біятэхналогіі раслін працуюць 20 чалавек, ажыццяўляючы каля 10 праектаў. Напрыклад, даследаванне ўздзеяння поліамінаў на ўстойлівасць раслін да стрэсу падтрымлівалася грантамі Еўрасаюза і Расійскага навуковага фонду.

*– Мы хутка развіваемся. Зрабілі лабараторыю клanавання раслін. Кожны год па праекце Еўрасаюза адпраўляем па пяць супрацоўнікаў у навуковыя цэнтры Еўропы на тры-чатыры месяцы. Вось прынялі наш артыкул у сур'ёзны брытанскі навуковы часопіс у галіне клеткавай біялогіі раслін Plant Journal. Ён пра ўплыў нанaчасціц на фізіялагічныя працэсы ў клетцы. Канечне, не хапае фінансавання, але мы аптымістычныя.*

**Гутарыў**
**Віталь АРЭШКА**

# Пераможцы конкурсу «Студэнт года–2015»

Конкурс «Студэнт года БДУ» праводзіцца з 2008 года і накіраваны на падтрымку таленавітай моладзі, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі студэнтаў у галіне навукі, мастацтва, спорту і грамадскай дзейнасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Сёлета для ўдзелу ў конкурсе было пададзена 59 заявак, з іх у намінацыях «Навука» – 20, «Лідар» – 21, «Спорт» – 8 і «Культура» – 10.

По выніках штогадовага конкурсу на званне «Студэнт года БДУ» экспертная камісія вырашыла вылучыць на атрыманне прэміі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта студэнтам ВНУ за актыўны ўдзел у навуковай, грамадскай і культурнага жыцця г. Мінска наступных навучэнцаў БДУ:

Намінацыя *«Навука»*:
***Каваленка Соф'я*** (фізічны факультэт, 5 курс);
Намінацыя *«Спорт»*:
***Кадоліч Кацярына*** (юрыдычны факультэт, 5 курс);
Намінацыя *«Культура»*:
***Аляксенка Крысціна*** (юрыдычны факультэт, 5 курс);
Намінацыя *«Лідар»*:
***Купчын Антон*** (гістарычны факультэт, 5 курс).

Прэміі Мінгарвыканкама прысуджаюцца студэнтам за распрацоўку і ўкараненне сацыяльна значных праектаў у галіне ідэйна-патрыятычнага і грамадзянска-прававога выхавання, адраджэння і развіцця нацыянальнай культуры і мастацтва, аховы здароўя і фарміравання здаровага ладу жыцця, асабістых дасягненняў у развіцці спорту, масавай фізкультуры, працы і вольнага часу моладзі, міласэрнасці, сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, экалогіі, архітэктуры і землеўпарадкавання, культуры і мастацтва, укаранення сучасных інфармацыйных і іншых навукаёмістых тэхналогій, за актыўны ўдзел у станаўленні і развіцці студэнцкага самакіравання, арганізацыі сацыяльна карыснай дзейнасці моладзевых грамадскіх аб'яднанняў, а таксама ўдзел і перамогі ў найбольш значных конкурсах, фестывалях і да т.п. гарадскога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў.

## Намінацыя «Культура»



**Крысціна АЛЯКСЕНКА, пераможца**
Юрыдычны факультэт, 5 курс



**Валерыя ВАСІЛЬЕВА, лаўрэат**
Інстытут журналістыкі, 5 курс



**Улад МАКАРЭВІЧ, лаўрэат**
Эканамічны факультэт, 3 курс



**Валянціна ПАЎЛАВА, лаўрэат**
Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, 4 курс

## Намінацыя «Спорт»



**Кацярына КАДОЛІЧ, пераможца**
Юрыдычны факультэт, 5 курс



**Арцём НАВАКОЎСКІ, лаўрэат**
Ваенны факультэт, 3 курс



**Яна ТУДВАСЕВА, лаўрэат**
Факультэт міжнародных адносін, 3 курс



**Іван СВЕНТУХОЎСКІ, лаўрэат**
Эканамічны факультэт, 5 курс

## Намінацыя «Лідар» («Універсітэт»)



**Антон КУПЧЫН, пераможца**
Гістарычны факультэт, 5 курс



**Уладзіслаў БУНОС, пераможца**
Факультэт сацыякультурных камунікацый, 5 курс



**Юлія ІШМУРАТАВА, пераможца**
Інстытут журналістыкі, 5 курс



**Вераніка ЛУД, пераможца**
Юрыдычны факультэт, 5 курс

## Паднамінацыя «Лідар» («Факультэт»)



**Максім СУРМАЧ, пераможца**
Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, 5 курс



**Ганна ШЭЎЧЫК, пераможца**
Юрыдычны факультэт, 5 курс



**Аляксандра ЛУГОЎСКАЯ, пераможца**
Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава, 5 курс



**Антон БЛАШКО, пераможца**
Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы, 4 курс



**Анастасія ВАШКЕВІЧ, пераможца**
Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, 4 курс



**Надзея КРЫВАНОГАВА, пераможца**
Факультэт філасофіі і сацыяльных навук, 4 курс

## Намінацыя «Навука»



**Соф'я КАВАЛЕНКА, пераможца**
Фізічны факультэт, 5 курс



**Ігар ДУБАНОС, пераможца**
Гістарычны факультэт, 5 курс



**Міхаіл ЯКЕЛЬЧЫК, лаўрэат**
Фізічны факультэт, 5 курс



**Паліна ЧЫКУН, лаўрэат**
Біялагічны факультэт, 5 курс



**Вольга ПАЎЛЮЦЬ, лаўрэат**
Факультэт сацыякультурных камунікацый, 4 курс



**Юлія ЛУШЫНА, лаўрэат**
Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій, 4 курс

СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

# Erasmus+ як яшчэ адзін шанец вучыцца і вандраваць па свеце

**У канцы кастрычніка БДУ арганізаваў трэнінг «Моладзевая мабільнасць: шлях да поспеху»** для студэнтаў. На працягу пяці дзён студэнтам расказалі пра акадэмічную мабільнасць, міжнародныя праграмы абмену студэнтаў і выкладчыкаў.



Таксама сёлета пачала дзейнічаць праграма крэдытнай мабільнасці Erasmus+, якая адрозніваецца ад усіх іншых, што існавалі раней.

Адметнасці праграмы нам патлумачыла галоўны спецыяліст па Erasmus+ Mobility начальнік аддзела міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва ўпраўлення міжнародных сувязяў БДУ Людміла ГАНЧАР.

Акадэмічная мабільнасць можа здзяйсняцца ў межах двухбаковых дамоваў з партнёрскімі універсітэтамі. У межах Erasmus+ дзейнічае міжнародная крэдытная мабільнасць. Таксама існуюць міжурадавыя і міжведамасныя пагадненні. І разнастайныя міжнародныя стыпендыяльныя праграмы.

Узгадваючы Erasmus+, варта зазначыць, што з пачатку навучальнага года ў БДУ было падпісана 12 пагадненняў. У кастрычніку праводзіўся конкурс на «атрыманне мабільнасці» для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і выкладчыкаў.

«Прычым не абавязкова толькі выкладчыкаў, але і супрацоўнікаў БДУ. Erasmus+ прадугледжвае мабільнасць для выкладання ці мабільнасць для праходжання стажыроўкі», – распавядае Людміла Уладзіміраўна.

Усяго ў Erasmus+ было вылучана: 12 месцаў для студэнтаў, 15 – для магістрантаў, 3 – для аспірантаў і 22 месцы для супрацоўнікаў і выкладчыкаў БДУ. А падавалася толькі адных студэнтаў 106 чалавек. Прапаноўваліся месцы ва ўніверсітэтах Румыніі, Іспаніі, Эстоніі, Польшчы, Славакіі, Чэхіі, Германіі, Швецыі, Францыі.

Пагадненні заключаюцца як узаемнае жаданне двух бакоў – партнёрскіх універсітэтаў.

«І для таго, каб было вылучана фінансаванне, еўрапейская ВНУ, якая зацікаўлена ў супрацоўніцтве з БДУ, падаецца на фінансаванне гэтага супрацоўніцтва ў сваёй краіне. Калі ВНУ атрымлівае грант, мы пачынаем сумесную працу».

Конкурс на гранты сёлета разлічаны на два гады. Студэнты паедуць у іншыя краіны на вясновы семестр. Сярод пераможцаў: факультэт міжнародных адносін, гістарычны факультэт, факультэт сацыякультурных камунікацый, Інстытут журналістыкі, а таксама эканамічны і юрыдычны факультэты.

Крытэрыямі адбору студэнтаў былі: акадэмічная паспяховасць, валоданне мовай навучання ў замежным універсітэце, матывацыя. Таксама ацэньваўся план навучання, які складалі прэтэндэнты на перамогу.

«Студэнт падае дакументы, збіраецца камісія. Яна складаецца з рэктара, начальніка упраўлення міжнародных сувязяў і іншых людзей, якія прадстаўляюць універсітэт. Таксама мусіць быць абавязкова адзін чалавек са студэнцкай асамблеі. Таму што неабходна прадстаўніцтва са студэнцкага самакіравання, а таксама адзін чалавек з кожнага факультэта. Усяго каля дваццаці асоб. Усе яны глядзяць дакументы і выстаўляюць адзнакі па кожным параметры. Студэнт перамагае па сярэднім бале з усіх адзнак».

***– На Ваш погляд, чаму шмат пераможцаў – студэнты з факультэта міжнародных адносін?***

– Мабыць, яны самыя актыўныя, больш цікавяцца. Інфармацыя публікавалася на сайце, у сацыяльных сетках. Удзельнічаць маглі студэнты ўсіх факультэтаў, але падаліся, на жаль, не ўсе. Яшчэ, на мой погляд, важнае веданне замежных моў. Бо на іншых спецыяльнасцях няма такой вялікай колькасці студэнтаў з узроўнем валодання замежнай мовай не ніжэйшы за B2 (upper-intermediate).

Праграма Erasmus+ распачала сваю працу не так даўно. Амаль усе ўніверсітэты – сябры БДУ – трансфармавалі супрацоўніцтва з праектаў «Эразмус Мундус».

«Напрыклад, Універсітэт Лейпцыга – наш даўні парнёр. І ў межах міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва і Erasmus+».

Зараз ідзе прыём заявак на грант ад еўрапейскіх універсітэтаў у іх краінах. Ён будзе доўжыцца да лютага. Тое, атрымаюць яны грант ці не, будзе вядома толькі летам.

***– Што трэба рабіць студэнтам, каб патрапіць на новы адбор?***

– Перш за ўсё, патрэбная акадэмічная паспяховасць. Але калі яе яшчэ няма, то ўжо позна, таму што яна павінна быць у цэлым добрая, не ніжэйшая за сем балаў. Калі студэнт адчувае, што недастаткова валодае замежнымі мовамі, то трэба заняцца самаўдасканаленнем і актыўна вывучаць. І, калі аб'яўлены конкурс, трэба дакладна расстаўляць прыярытэты і разумець навошта студэнту навучанне за мяжой. Ці сапраўды яно яму карыснае? Ці стане яно крокам наперад у фармаванні яго як спецыяліста? Трэба задаваць самому сабе такія пытанні.

**Фаіна НАКАНЕЧНАЯ**

ПА ДОСВЕД

# Паказалі сябе Еўропе

Універсітэт прыкладных навук г. Мітвайда (Германія) высока ацаніў міжнародны праект БДУ «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі». Прэзентацыя дадзенага праекта адбылася ў рамках візіту дэлегацыі студэнцкіх арганізацый БДУ ў нямецкі універсітэт.



Акрамя таго, дасягнута дамоўленасць пра ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў факультэта медыя Універсітэта прыкладных навук ва ўдзеле ў 2016 годзе ў выязным міжнародным семінары «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі». Як адзначаў нямецкі бок, гэта дазволіць павысіць узровень прафесіяналізму пры стварэнні студэнцкіх СМІ, актывізаваць супрацоўніцтва з калегамі з іншых ВНУ і атрымаць неацэнны досвед журналістаў, якія ўжо адбыліся як прафесіяналы.

Візіт дэлегацыі БДУ ва Універсітэт прыкладных навук г. Мітвайда адбыўся з 7 па 13 снежня з мэтай удзелу ў міжнародным форуме студэнцкіх аб'яднанняў «Мітвайда сустракае сяброў з Усходняй Еўропы». У яе склад увайшлі прадстаўнікі сямі студэнцкіх арганізацый. Узначаліў дэлегацыю старшыня Студэнцкай асамблеі БДУ Яўген Харук.

Усяго на дадзеным форуме ў Германіі БДУ прадставіў больш за 10 праектаў. Гэта студэнцкія ініцыятывы, накіраваныя на развіццё творчага патэнцыялу беларускай моладзі ў галіне адукацыі, навукі, культурнай і спартыўнай дзейнасці. Адмысловая ўвага была нададзена праектам БДУ сацыяльнай праблематыкі. Так, нямецкія студэнты пазнаёміліся з праектамі студэнцкага саюза БДУ «Мая школа», «Капуснік», мерапрыемствамі БРСМ БДУ «Універсітэт – твой крок у будучыню» і савета земляцтваў «Дні культур», «Наўруз Байрам». А каардынацыйны савет распавёў пра «Сістэму органаў студэнцкага самакіравання студэнцкага гарадка». Таксама былі прэзентаваны праекты студэнцкага савета па якасці адукацыі «Дэбат-клуб», «Навука на пальцах», мерапрыемствы пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў «Падпалім лёд разам!», «BSU-фэст», савета старастаў «Ты – стараста!» і інш.

Адзначым, у працы форуму бралі ўдзел прадстаўнікі 8 універсітэтаў з Беларусі, Германіі, Расіі і Украіны. Для моладзі былі арганізаваны круглыя сталы, дзе абмяркоўваліся пытанні інтэрнацыяналізацыі, універсітэта будучыні, далейшыя шляхі ўзаемадзеяння паміж студэнтамі розных краін і інш.

Акрамя таго, дэлегацыя БДУ ў рамках візіту пазнаёмілася са структурай універсітэта горада Мітвайда, сістэмай студэнцкага самакіравання, тэхнічнай і навуковай базамі.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**

З НАГОДЫ

# Чараўніцтва сцэны

Гран-пры XII Міжнароднага фэсту студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар. БДУ–2015» атрымаў спектакль «Вій» тэатральнай майстэрні «Студыёзы» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ).

Акрамя галоўнага прыза студэнты БДУКМ (на фота) за спектакль «Вій» былі адзначаныя яшчэ ў дзвюх намінацыях: «Найлепшая сцэнаграфія» і «Найлепшая мужчынская роля другога плана», якую атрымаў Мікіта Прымачэнка.

Дыплом за «Найлепшую жаночую ролю» атрымала студэнтка майстэрні Мікалая Кірычэнкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Дар'я Парменянкова. У намінацыі «Найлепшая мужчынская роля» перамогу атрымаў кіяўлянін Дзяніс Грыгарук (тэатр «СІНЕМАТОГРАФЪ», Украіна). Яго калега па тэатры Іна Кузьміна адзначана дыпломам «Найлепшая жаночая роля другога плана» за акцёрскую працу ў спектаклі па творы Леаніда Андрэева «Аповесць пра сем павешаных».

Як адзначылі члены журы падчас цырымоніі закрыцця мерапрыемства, у конкурснай праграме назіралася магутная канкурэнцыя; усе пастаноўкі былі яркімі і з цікавымі сцэнічнымі рашэннямі. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне прысудзіць калектывам восем спецыяльных дыпломаў. Асабліва падкрэслім, спецыяльным дыпломам «За падтрымку сучаснай беларускай драматургіі» ўзнагароджаны пастаянны ўдзельнік «Тэатральнага куфра» студэнцкі тэатр Tut Тартускага ўніверсітэта (Эстонія). Прыз заснаваў генеральны партнёр фэсту партал Kufar.by.

Фаварытаў конкурснай праграмы ў розных намінацыях вызначыў савет міжнароднага журы пад старшынствам доктара мастацтвазнаўства Макі Васадзэ (Грузія).

Нагадаем, спектаклі студэнцкіх калектываў і тэатральных дзеячаў з 11 краін прайшлі на сцэне Ліцэя БДУ з 30 лістапада па 5 снежня. У фэсце прынялі ўдзел прадстаўнікі з 11 краін: Беларусі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Грузіі, Ірана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны і Эстоніі.

Арганізатарам XII Міжнароднага фэсту студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар. БДУ–2015» выступіла ўпраўленне па справах культуры БДУ.

**Анастасія ПАРАГАС**



У СТУДГАРАДКУ

# Год на «выдатна»

Зусім хутка на парог ступіць новы 2016 год, і значыць, прыйшоў час падвесці вынікі года, які сыходзіць. І для інтэрнатаў нашай альма-матар 2015 год стаў вельмі прадуктыўным і багатым на перамогі. Так, напачатку снежня былі абвешчаны вынікі агляду-конкурсаў на найлепшы інтэрнат у Маскоўскім, Ленінскім і Цэнтральным раёнах г. Мінска.

У аглядзе-конкурсе на найлепшы студэнцкі інтэрнат Ленінскага раёна г. Мінска прынялі ўдзел адразу некалькі нашых інтэрнатаў: другі, пяты, шосты і сёмы. Падчас конкурсу камісія ацэньвала не толькі ўмовы пражывання ў інтэрнатах, магчымасці для самарэалізацыі студэнтаў, выканання санітарных нормаў і правілаў унутранага распарадку, але і творчы складнік: 10 снежня жыхары інтэрнатаў выступілі з творчымі нумарамі, якія прэзентавалі інтэрнаты. У гэты ж дзень былі падведзены вынікі. ***Інтэрнат № 2*** БДУ (вул. Кастрычніцкая, 2) быў узнагароджаны дыпломам як самы крэатыўны інтэрнат, а ***інтэрнат № 7*** БДУ (Кастрычніцкая, 10а) заняў ганаровае другое месца. Мы віншуем з гэтым дасягненнем педагагічны калектыў і ўсіх жыхароў інтэрната № 7. А жыхароў сёлета ў «сямёрцы» налічваецца больш за 1100 чалавек: гэта студэнты ДІКСТ, філалагічнага, ваеннага і механіка-матэматычнага факультэтаў. Для сваіх студэнтаў інтэрнат прапануе мноства магчымасцяў, бо ў ім ёсць розныя пакоі сацыяльна-культурнага і побытавага прызначэння: самападрыхтоўкі, актыўнага адпачынку, самакіравання, імяніннікa, актавая зала, відэасалон, пральны і прасавальны.

Яшчэ адным канкурсантам на аглядзе-конкурсе на найлепшы студэнцкі інтэрнат ужо Маскоўскага раёна г. Мінска стаў ***інтэрнат № 4*** (вул. Чурлёніса, 7). Першы этап конкурсу – разгляд партфоліа інтэрната – творчай справаздачы, якая адлюстроўвае наступныя кірункі працы: стварэнне спрыяльных умоў для пражывання ў інтэрнаце; умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай і сацыякультурнай базы інтэрната; праца па папярэджанні і прафілактыцы правапарушэнняў; арганізацыя інфармацыйна-выхаваўчай працы і інш. Другі этап – аб'езд інтэрнатаў членамі журы.

Па выніках агляду-конкурсу наш інтэрнат атрымаў перамогу, падзяліўшы першае месца з інтэрнатам № 4 БДУІР.

Інтэрнат № 4 БДУ – унікальны інтэрнат, бо сярод 1130 студэнтаў, якія жывуць у ім, не толькі студэнты БДУ (эканамічны факультэт, Інстытут журналістыкі, Дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава), але і студэнты БНТУ.

З моманту адкрыцця ў 2013 годзе інтэрнат з кожным годам становіцца ўсё лепшым: функцыянуе мноства пакояў актыўнага адпачынку, навучальных заняткаў, пральны, прасавальны пакой і інш; студэнцкім саветам інтэрната і педагагічным калектывам праводзіцца мноства мерапрыемстваў і акцый, якія становяцца добрай традыцыяй і спрыяюць знаёмству і згуртаванню жыхароў інтэрната.

Акрамя таго, былі адзначаныя не толькі студэнцкія інтэрнаты. ***Інтэрнат № 8 для супрацоўнікаў*** БДУ (адкрыты ў 1985 г.) заняў 3 месца ў аглядзе-конкурсе на найлепшы інтэрнат для працаўнікоў Цэнтральнага раёна горада Мінска.

Падводзячы вынік, можна з упэўненасцю сказаць, што нашы інтэрнаты – гэта не проста месца знаходжання студэнтаў і супрацоўнікаў, а другі дом, у якім яны пачуваюцца ўпэўнена і камфортна.

**Яўгенія КАШЛЕЙ**



ДОБРАЯ СПРАВА

Яшчэ фота і відэа gazeta.bsu.by

# БДУ дорыць дзецям казку

## Святочны канцэрт «Дух Каляд» прайшоў 16 снежня

З прыходам зімы ўсе мы – дарослыя і дзеці – знаходзімся ў чаканні цуду. Сапраўдную зімовую казку падарыў усім БДУ 16 снежня падчас дабрачыннага канцэрта «Дух Каляд» для 150 дзяцей рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Ждановічы».

Нягледзячы на тое, што зіма сёлета не спяшаецца пацешыць нас марозам і снегам, у Ліцэі БДУ лунаў дух каляд. Казачныя персанажы, у якіх пераўвасобілася тэатральная група «Мімы БДУ», забаўлялі дзяцей. Дзеці гулялі і танчылі, а пасля паклікалі на свята Дзеда Мароза. Разам з дзецьмі ён вадзіў карагоды і дарыў падарункі. Сярод ахвотнікаў распавесці Дзядулю Марозу верш знайшліся не толькі дзеці, але і іх бацькі. А пасля пачаўся навагодні канцэрт.

Канцэрт адкрыў дзіцячы ансамбль «Літарынка», які падарыў тым, хто сабраўся, танец чароўных сняжынак і снегавічкоў. А затым з віншаваннем выступіў рэктар БДУ Сяргей Абламейка. Ён павітаў дзяцей і супрацоўнікаў ДРАЦ «Ждановічы», з якімі ўніверсітэт сябруе ўжо даўно, а таксама выказаў спадзяванне, што студэнты і кіраўніцтва БДУ будуць часцей супрацоўнічаць з дзецьмі на падобных святах. Рэктар запрасіў дзяцей паступаць у БДУ, дзе вучыцца самая таленавітая і творчая моладзь краіны.



Павіншавалі дзяцей з надыходзячымі святамі і зоркі беларускай эстрады. На сцэне выступілі гурты «Лэйла» і Napoli, запальны танец выканаў калектыў Pops Foundation, а праспявалі для дзяцей Alen Hit, Вольга Сацюк, Ян Маерс, Аляксей Gross, Улад Чыжыкаў і Самара Хасун. Далучыліся да віншаванняў і творчыя калектывы БДУ: ансамблі танца «Крыжачок» і «Глорыя», фолк-медыя-група «Неруш», фальклорны ансамбль «Тутэйшая шляхта», танцавальны калектыў Freaks, студэнты і выкладчыкі БДУ – Дзмітрый Нікановіч і Антон Мартынаў праспявалі для дзяцей, а Ягор Касякоў у пары з Анастасіяй Бельмач падарылі ім пачуццёвы танец.

Дзеці радасна сустракалі кожнага выступоўцу, танчылі і падпявалі артыстам, а таксама распавялі вядучым пра свае планы на навагоднюю ноч.

Упершыню ў рамках канцэрта прайшла акцыя «Падары радасць дзецям», праз якую ўсе ахвотнікі змаглі прынесці навагоднія падарункі. Дзякуючы мінчанам выхаванцы рэабілітацыйнага цэнтра атрымалі салодкія пачастункі, школьныя прылады і навагоднія цацкі.

З намі падзяліўся сваімі ўражаннямі адзін з вядучых імпрэзы *Жан Сянкевіч*: «Такія мерапрыемствы адназначна вельмі важныя. Напярэдадні навагодніх святаў выступіць на сцэне – гэта самае меншае, што кожны з удзельнікаў канцэрта мог зрабіць для дзяцей, якія ў гэты дзень былі ў зале. Дзякуй універсітэту, што даў магчымасць стаць адным з удзельнікаў святочнай праграмы «Дух Каляд»».

**Дар'я КОЎЗА**

СПАРТПЛЯЦОЎКА

# Падведзены вынікі спартакіяды 2015 года

## Пераможцы названы на святочным спартыўным вечары, які прайшоў 22 снежня.

Першае месца ў чарговы раз заняў **юрыдычны факультэт,** на другім – **факультэт міжнародных адносін.** Замыкае тройку **механіка-матэматычны факультэт.** Усяго ў спартакіядзе ўдзельнічалі 18 каманд. Спаборніцтвы праходзілі па 20 відах спорту.

Названы таксама лаўрэаты 5 намінацый.

*«Найлепшым спартсменам года (алімпійскі від спорту)»* прызнаны шасцікурснік юрыдычнага факультэта **Віктар Сасуноўскі.**

Сёлета найлепшай у намінацыі *«Найлепшая спартсменка года (алімпійскі від спорту)»* прызнана студэнтка другога курса юрыдычнага факультэта **Алена Амялюсік.**

Чацвёртакурснік юрыдычнага факультэта **Сяргей Карповіч** стаў *«Найлепшым спартсменам года (неалімпійскі від спорту)».*

*«Найлепшай гульнявой камандай»* названа **жаночая зборная БДУ па футболе.**

Тытул *«Найлепшы трэнер-выкладчык года»* дастаўся старшаму выкладчыку кафедры фізічнага выхавання і спорту **Уладзіміру Фралову.**

*«Найлепшым трэнерам-арганізатарам года»* быў названы старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту **Мікалай Прусаў.**



*З кубкам спартакіяды–2015: трэнер Анжэла Атрошчанка, намеснік дэкана юрфака Андрэй Шыдлоўскі і найлепшая спартсменка года Алена Амялюсік*

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

30 снежня 2015 года
Падпісана да друку 28.12.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by